# Сябрам БРСМ за ўдзел у пікетах абяцаюць вызваленне ад заняткаў і па 15 рублёў на кішэню




Назіральнікам кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары" з ананімных крыніц стала вядомая перапіска на закрытым чаце студэнтаў эканамічнага факультэта БДУ. З паведамленняў у чаце вынікае, што студэнтаў актыўна запрашаюць браць удзел у перадвыбарчых пікетах па вылучэнні ў якасці асобных кандыдатаў у дэпутаты. Прычым, як вынікае з перапіскі, прыняць удзел у пікеце менавіта ў якасці членаў ініцыятыўных груп.

Устаноўленая праз сацыяльныя сеткі **Юля Муштукова** паведамляе 29 ўдзельнікам чата:

Справаздача па выніках назірання за рэгістрацыяй ініцыятыўных груп грамадзян

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Мясцовыя выбары-2018

## АПОШНІЯ НАВІНЫ

Вярхоўны суд пакінуў без задавальнення апеляцыі асуджаных да смяротнага пакарання (дапоўнена)

Баранавіцкі ГАУС не бачыць парушэнняў у сваіх жа дзеяннях

У Мінску ўзнагародзілі Чэмпіёнаў

Сітуацыя з правамі

> *"Добрай раніцы ) Патрэбныя 3 чалавекі на перадвыбарчы ( выбары мясцовага Савета Дэпутатаў) пікет к 12-00. Проста пастаяць у якасці сябра ініцыятыўнай групы гадзіны 1.5-2. Вызваленне на ўвесь дзень + 15 р. (рублёў)."*




Іншы ўдзельнік чата **Іван Шчэрбін** удакладняе:

чалавека ў Беларусі. Лістапад 2017

ВЫДАННІ

‹ ›

Напрамкі дзейнасці

ВЯСНА

Жадаеш дапамагчы? Запрашаем валанцёраў

> *“Вось пікеты, размяшчэнне і час:*

1. > *12.00 – 14.00 –пр. Пераможцаў, 89 (каля крамы “Суседзі);*
2. > *2. 17.00-19.00 – “Арэна-Сіці” (пр. Пераможцаў, 84);*
3. > *12.00-14.00 – вул. Раманаўская слабада, 28 (кінатэатр “Беларусь”;*
4. > *12.00-14.00 – вул Шчадрына, 83 (каля УЗ 16-я гарадская паліклініка);*
5. > *12.00-14.00 – вул. Чарвякова, 57 (каля магазіна “ГІППО”).*

Людзі Вясны




Варта адзначыць, што Юля Муштукова з'яўляецца сакратаром камітэта БРСМ эканамічнага факультэта БДУ, а Іван Шчэрбін – начальнік штаба працоўных спраў БРСМ БДУ.

Эксперты кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары" адзначаюць, што дадзеная інфармацыя сведчыць аб грубых парушэннях дзеючага выбарчага заканадаўства.

Так, у адпаведнасці з ч.8 арт. 48 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь палітычныя партыі, іншыя грамадскія аб'яднанні, іншыя арганізацыі, грамадзяне

Рэспублікі Беларусь **не маюць права** аказваць іншую матэрыяльную дапамогу пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў, рэферэндума, акрамя ўнясення грашовых сродкаў у пазабюджэтны фонд і ў выбарчыя фонды кандыдатаў у дэпутаты.

Выкарыстанне асобай, якая вылучаецца ў якасці кандыдата ў дэпутаты грашовых сродкаў ці іншай матэрыяльнай дапамогі ў парушэнне дзеючага заканадаўства **цягне адпаведна адмову ў рэгістрацыі** ў якасці кандыдата ў дэпутаты ці адмену рашэння аб рэгістрацыі.

Трэба адзначыць, што згодна з арт. 48.1 Выбарчага кодэкса выбарчыя фонды кандыдатаў у дэпутаты могуць ствараццa **толькі пасля рэгістрацыі** ў якасці кандыдата ў дэпутаты адпаведнай тэрытарыяльнай выбарчай камісіяй. Магчымаць аплаты выдаткаў па зборы подпісаў прадугледжваецца дзеючым заканадаўствам толькі пры вылучэнні ў якасці кандыдата ў Прэзідэнты.

Акрамя таго ў дадзенай сітуацыі мае значэнне паходжанне абяцаных грошай для тых, каго запрашаюць "проста пастаяць у якасці сябраў ініцыятыўнай групы". Калі гэта не асабістыя сродкі грамадзянкі Муштуковай, а арганізацыі БРСМ, мы маем справу з **забароненым выкарыстаннем адміністратыўнага рэсурсу**. Арганізацыям, якія часткова ці цалкам фінансуюцца з дзяржаўнага бюджэта (БРСМ у дадзеным выпадку) наогул забаронена ўдзельнічаць у фінансаванні кандыдатаў.

Таксама парушэннем арт.61 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь будзе з'яўляцца і ажыццяўленне збору подпісаў асобамі, якія не з'яўляюцца сябрамі ініцыятыўных груп.

Па дадзеных фактах парушэнняў дзеючага заканадаўства будзе пададзеная адпаведная заява ў органы пракуратуры для дачы прававой ацэнкі і далейшага пракурорскага рэагавання.

Вось такія сумнеўныя метады агітацыйнай працы выкарыстоўваюць ініцыятыўныя групы па вылучэнні ў кандыдаты ад самай масавай моладзевай арганізацыі – “Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі”.

*”Праваабаронцы за свабодныя выбары”.*

Я рекомендую Lubię to 13 Твитнуть G+

15.12.2017 **Тэгі**: выбары-2018

Вясна. Правы...
Нравится
Нравится вам и еще 252 друзьям

Вясна. Правы чалавека ў Беларусі
Скажы НЕ смяротнаму пакаранню!
2,044 zapisani
Zapisz się na nowości

### Як забаранілі пікет за свабоду сходаў у разгар "жэстачайшай лібералізацыі"

### Павел Сапелка: Уцёкі зняволеных са спецшкол даўно сталі практыкай гэтых установ

## СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

### “Вясна” і БХК: Беларусь – кепскі прыклад ажыццяўлення свабоды мірных сходаў

### Праваабаронцы адшукалі актывіста Паўла Пракаповіча ў... ізалятары

### Суд аштрафаваў легендарнага Антося Вусовіча, які некалі дамогся змены свайго прозвішча

## ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

### Міхаіл Жамчужны асцерагаецца за сваё жыццё

### Скаргу Міхаіла Жамчужнага на спагнанне адміністрацыі калоніі разгледзіць суд

### Апошні падарунак ад сына. Сям’я атрымала кампэнсацыю за жыццё Ігара Пцічкіна

## ПАРТНЁРСТВА

## СЯБРОЎСТВА

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS